Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2014-11-21

# Справаздача кафедры

**Так склаліся лічбы, што юбілейны год філалагічнага факультэта БДУ стаў значнай датай і для кафедры тэорыі літаратуры, заснаванай дваццаць гадоў таму.**

Дэкан факультэта Іван Роўда падчас юбілейнага пасяджэння кафедры звярнуў увагу на плённую працу створанай пры кафедры вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору і студэнцкай навуковай лабараторыі, выданне электроннага часопіса «Дзьмухавец».

На юбілейнае пасяджэнне завіталі і вядомыя навукоўцы, і колішнія выпускнікі ўніверсітэта, якія займаліся на спецсемінарах кафедры тэорыі літаратуры і з удзячнасцю прыгадваюць сваіх выкладчыкаў. Своеасаблівай філалагічнай гульнёй стаў пошук эпітэтаў і метафар, якія аптымальна стасаваліся да дзейнасці кафедры. Іван Роўда прапанаваў эпітэт «пладавіты» — і сапраўды, колькасць публікацый супрацоўнікаў кафедры за апошнія пяць гадоў налічвае больш як 650 артыкулаў! Метафары «крыніцы» і «кузні» прапанавала загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Таццяна Валодзіна, якая разам з Міхасём Тычынам прынесла віншаванні ад Нацыянальнай акадэміі навук. Навіной для ўдзельнікаў свята стала паведамленне дырэктара Беларускага дзяржаўнага архіва-музея беларускай літаратуры і мастацтва Ганны Запартыка пра адкрыццё ва ўстанове філіяла кафедры тэорыі літаратуры. На думку Г. Запартыка, архіў-музей будзе добрым месцам для адпрацоўкі дысцыплін па прыкладным літаратуразнаўстве: студэнты пазнаёмяцца з працай у фондах і правядзеннем экскурсій. І, вядома, спадчына беларускіх пісьменнікаў, якая захоўваецца ў архіве, застаецца выдатнай базай для літаратуразнаўчых даследаванняў як прафесараў, так і студэнтаў.

На юбілейным пасяджэнні кафедры тэорыі літаратуры панаваў святочны, прыўзняты настрой, гучала шмат апладысментаў. Акрамя віншавальных слоў і распаведаў пра гісторыю кафедры, тут можна было пачуць дзве ўзнёслыя прытчы пра матылька і нават беларускую калядку ў выкананні магістрантаў-кітайцаў!

**Алеся ЛАПІЦКАЯ**

Алеся Лапіцкая. Справаздача Кафедры